Весці БДПУ. Серыя 1. 2016. № 4. С. 104–107.

УДК 81’282(476.7)

# ІЗАГЛОСЫ І ПУЧКІ ІЗАГЛОС НА КАРТАХ «АТЛАСА ГАВОРАК ПАЎНОЧНА-ЎСХОДНЯЙ БРЭСТЧЫНЫ»

**Ю. В. Чарнякевіч,**
*аспірант кафедры беларускага моваазнаўства БДПУ*

UDC 81’282(476.7)

# THE IZOGLOSS AND BUNCH OF IZOGLOSS ON A MAPS OF «ATLAS GAVORAK PAUNOCHNA-USKHODNYAY BRESTCHYNY»

**Y. Charnyakievich,**
*graduate for chair of the Belarusian linguistics, BSPU*

Паступіў у рэдакцыю 02.11.16.

Received on 02.11.16.

У артыкуле комплексна і сістэмна на аснове вялікага фактычнага матэрыялу, які змешчаны ў ізаглосных картах «Атласа гаворак паўночна-ўсходняй Брэстчыны», аналізуюцца гаворкі паўночна-ўсходняй Брэстчыны на ўсіх узроўнях дыялектнай мовы: фанетычным, марфалагічным і лексічным. У межах кожнага з гэтых узроўняў апісаны асноўныя моўныя асаблівасці, характэрныя для маўлення жыхароў рэгіёна. Па выніках праведзенага даследавання вылучаны 6 падгруп гаворак і акрэслены дакладныя межы паміж імі: гродзенска-баранавіцкія гаворкі з аканнем (уключаюць тры падгрупы: сялявіцкую, коўбавіцка-альхоўскую, альшаніцка-боркаўскую) і гаворкі з оканнем (уключаюць таксама тры падгрупы: верхнеясельдскую, паўночнабрэсцкую, аброўска-рудненскую). Таксама ў артыкуле вызначаны ізаглосы, якія дазволілі правесці межы паміж падгрупамі і гаворкамі, што месцяцца на дадзенай тэрыторыі.

*Ключавыя словы:* паўночна-ўсходняя Брэстчына, фанетыка, марфалогія, лексіка, гаворка, групоўка гаворак, гаворкі з аканнем, гаворкі з оканнем, падгрупы гаворак, гродзенска-баранавіцкія, сялявіцкая, коўбавіцка-альхоўская, альшаніцка-боркаўская, паўночнабрэсцкая, верхнеясельдская, аброўска-рудненская.

The chief purpose of the article is to consider, based on the actual and big material, which place on the “Atlas of dialects of North-East Brestchyny”, for the first time, integrated and systematic research dialects of North-east Brestchyny on all levels of dialect language: phonetics, morphology and lexicon. In borders each of this levels describe base language feature, which typical for speech inhabitants of region research. The results of the research proved that the following 6 subgroups of dialects and designate precise between them: grodzenska-baranavitskija dialects with retention of unstressed «a» (including three subgroups: seliavickuju, koubavicka-alhouskuju, alshanicka-borkauskuju) and dialects with retention of unstressed «o» (including three subgroups too: paunochnabresckuju, verkhnejaseldskuju, abrouska-rudnenskuju). The article also marked isoglosses, which enabled the border between subgroup and dialects on this territory.

*Keywords:* North-east Brestchyna, phonetics, morphology, lexicon, dialect, classification dialects, dialects with retention of unstressed «o», dialects with retention of unstressed «a», subgroup dialects, grodzenska-baranavitskija, seliavickija, koubavicka-alhouskija, alshanicka-borkauskija, paunochnabresckija, verkhnejaseldskija, abrouska-rudnenskija.

Паўночна-ўсходняя Брэстчына – тэрыторыя на памежжы гістарычна-этнаграфічных рэгіёнаў Панямоння, Заходняга і Усходняга Палесся, а таксама Цэнтральнай Беларусі. Мясцовыя гаворкі знаходзяцца ў зоне міждыялектных кантактаў. На поўдні названага рэгіёна навукоўцы праводзяць мяжу паміж асноўным масівам беларускіх гаворак і заходнепалескімі гаворкамі [1, карта № 75].

Лінгвагеаграфічнае вывучэнне маўлення жыхароў паўночна-ўсходняй Брэстчыны дазволіла ўстанавіць групоўку гаворак рэгіёна на ўсіх узроўнях мовы. На гэтай тэрыторыі выразна супрацьстаўляюцца два асноўныя арэалы: паўночны і паўднёвы, або **гаворкі з аканнем** і **гаворкі з оканнем**. Гэтыя два арэалы супрацьпастаўляюцца не толькі на фанетычным, а таксама на марфалагічным і лексічным узроўнях дыялектнай мовы.

Гаворкі з аканнем паўночна-ўсходняй Брэстчыны з’яўляюцца складовай часткай гродзенска-баранавіцкай групы гаворак паўднёва-заходняга дыялекту [2, с. 393–394; 3, с. 176–177]. Згодна з ранейшымі даследаваннямі беларускіх дыялектолагаў, у арэале гаворак з оканнем вылучаюцца гаворкі асноўнага масіву беларускай мовы, або паўночнабрэсцкая група, пераходныя, ці сярэднебрэсцкая група і брэсцка-пінскія, або сярэднезагародская [4, с. 7–11]. Паўночнабрэсцкая група гаворак была ўпершыню выдзелена ў 1968 годзе Н. Т. Вайтовіч [5, с. 81]. Адаса-

Рэпазіторый БДПУ

бленне астатніх груп гаворак ажыцёўлена Ф. Д. Клімчуком [4, с. 7–11], а пазней асаблівасці іх былі ўдакладнены і канкрэтызаваны ў межах Бярозаўскага (А. В. Леванцэвіч), Пружанскага (А. А. Босак), Івацэвіцкага (Я. Р. Самуйлік) раёнаў Брэсцкай вобласці [6–8].

На падставе ізаглосных карт «Атласа гаворак паўночна-ўсходняй Брэстчыны» [9, карты № 345–364], дзе адлюстраваны 71 ізаглоса розных моўных узроўняў (ізафоны, ізаморфны, ізалексы), на тэрыторыі паўночна-ўсходняй Брэстчыны былі вылучаны два арэалы гаворак (гаворкі з оканнем і аканнем), а таксама ў межах гэтых арэалаў шэсць падгруп гаворак і асобныя гаворкі.

Так, карты мерыдыяннага ружанска-івацэвіцка-ганцавіцкага пучка ізаглос (5 пучкоў, 15 ізаглос) [9, карты № 345–349] выразна падзяляюць тэрыторыю даследавання на два арэалы: гаворкі з оканнем і гаворкі з аканнем. Для **гаворак з аканнем** характэрны такія асаблівасці, як няпоўнае недысімілятыўнае аканне, г. зн. у словах і іх формах у адпаведнасці з галоснымі **[а]** і **[о]** у становішчы пад націскам у ненаціскным становішчы мае месца галосны гук **[а]**, але гэтая з’ява не ахоплівае ўсе ненаціскныя склады: *трава́, вада́, але мно́го, ма́ло, ба́ц’ко* і падобныя. Таксама ў гэтых гаворках назіраецца пераход **[э]** у **[о]** у некаторых словах і марфалагічных формах: *м’о́д, м’о́рзлы, б’о́рдо, го́рэ, н’эс’о́м*; наяўнасць моцнага недысімілятыўнага якання (або акання пасля мяккіх зычных) у паслянаціскным складзе: *во́с’ан’*; ужыванне асабовых займеннікаў без пратэтычнага **[в]**: *йон, йана́, йано́, йаны́*; адсутнасць эпентычных **[л’]**, **[й]** у формах дзеясловаў абвеснага ладу цяп. часу 3 асобы мн. ліку І спражэння з асновай на **губны**: *ро́б’ац’, сп’а́ц’, ко́рм’ац’*, назоўнікі н. роду адз. л. у форме М. склону прадстаўлены з націскным канчаткам **-э**: *на пл’ачэ́, у в’адрэ́*; наяўнасць суфікса **-ць** у формах інфінітыва з асновай на галосны: *жац’, хадз’і́ц’*; наяўнасць мяккага зычнага [с’] у постфіксе **-ся** зваротных дзеясловаў 1 асобы адз. л.: *байу́с’а, купа́йус’а (байу́с’о, купа́йус’о)*; ужываюцца словы *драс’о́н, ліхарадка, трасца, сапагі* і інш.

У сваю чаргу, у **гаворках з оканнем** адзначаны свае адметныя фанетычныя, марфалагічныя і лексічныя формы: уласна оканне – вымаўленне на месцы этымалагічнага **[о]** у ненаціскным становішчы гука **[о]**: *молоко́, вода́, коро́ва*; вымаўленне на месцы этымалагічнага **[ы]** пасля губных пад націскам, а таксама ў першым і другім складах перад націскам галоснага **[і]**: *м’і, п’іл, в’ісо́к’і, в’іб’іва́ц’і*; ужыванне асабовых займеннікаў з пратэтычным **[в]**: *вон, вона́, воно́, воны́*; наяўнасць эпентычнага **[л’]** у формах дзеясловаў абвеснага ладу цяп. часу 3 асобы мн. л. І спражэння з асновай на **губны**: *ро́бл’ац’, спл’а́ц’, ко́рмл’ац’*; назоўнікі ж. роду мн. л. у форме Р. склону прадстаўлены націскным канчаткам **-эй**: *хатэ́й, сц’энэ́й*; наяўнасць суфікса **-ці** ў формах інфінітыва з асновай на галосны: *жа́ц’і, хадз’і́ц’і*; наяўнасць цвёрдага зычнага [с] у постфіксе **-са** зваротных дзеясловаў 1 асобы адз. л.: *байу́са, купа́йуса (байу́со, купа́йусо)*; ужываюцца словы *гарча́к, шо́хля, чо́баты* і інш.

Акрамя таго, некалькі мерыдыянных бярозаўска-івацэвіцка-ганцавіцкіх пучкоў ізаглос (два пучкі, 8 ізаглос) [9, карта № 350, 355], бярозаўска-выганаўска-рудненскі, бярозаўска-целяханска-ганцавіцкі, бярозаўска-аброўска-рудненскі, ружанска-бярозаўска-выганаўска-рудненскі і бярозаўска-выганаўска-сакалоўскі пучкі ізаглос (5 пучкоў, 20 ізаглос) [9, карта № 351–354, 356], а таксама сакалоўска-выганаўска-гуткаўскі і сакалоўска-ганцавіцка-рудненскі (6 ізаглос у абодвух пучках) [9, карта № 362–363] вызначаюць некаторыя адметныя рысы падгруп гаворак у межах арэалу з оканнем. Гэта, напрыклад, такія асаблівасці, як вымаўленне губна-губнога **[w]**: *починны – поўны*, вымаўленне галосных на месцы этымалагічнага **[а]**: *давай, знайшла – довай, знойшла*, наяўнасць ненаціскных канчаткаў прыметнікаў н. роду адз. л. у форме Н. склону: *старэе – старое*, размежаванне формаў інфінітыва *стрыгці, бегці – стрыгчы, бегчы, пякці – пячы*, супрацьпастаўленне лексем *полі́ўка – заці́рка, цвіркун – свяршчок* і г. д.

На аснове прааналізаваных ізаглос у межах арэалу з оканнем вылучаны тры падгрупы гаворак – верхнеясельдская, паўночнабрэсцкая і аброўска-рудненская. Так, **верхнеясельдскай падгрупе гаворак** уласціва наяўнасць эпентычнага **[й]** у формах дзеясловаў абвеснага ладу цяп. часу 3 асобы мн. ліку І спражэння з асновай на **губны**: *ро́бйац’, спйа́ц’, ко́рмйац’*; назоўнікі муж. роду адз. л. у Д. склоне адзначаны з канчаткам **-ові**: *бра́тов’і, сы́нов’і*; наяўнасць эпентычнага **[й]** у формах дзеясловаў цяп. часу 1 асобы адз. л. І спражэння з асновай на **губны**: *драмйу́*; наяўнасць формаў інфінітыва тыпу *пэчы́, тоўчы́*; ужываюцца словы *ка́доўб, пра́чык* і інш.

**Паўночнабрэсцкай падгрупе гаворак** уласцівы вымаўленне галоснага **[а]** перад цвёрдым губным у першым складзе перад націскам на месцы этымалагічнага **[э]**: *бада́, вадро́*; вымаўленне мяккіх зычных **[з’], [с’], [н’]** перад галоснымі пярэдняга рада **[і], [э]**: *з’эмл’а́, с’э́мйэ; н’э́хто, н’і́ткі*; вымаўленне на месцы этымалагічна мяккіх **[т’], [д’]** зычных **[ц’], [дз’]** перад ***[і], *[ɘ̂]**: *ц’і́хо, дз’і́к’і; дз’эн’, ц’эп’э́р*; наяўнасць націскных канчаткаў **-эе** прыметнікаў

Рэпазіторый БДПУ

н. роду адз. л. у форме Н. склону: *старэ́йэ*; ужываюцца словы *цв'ірыку́с, бу́л'каўк'і, часно́к* і інш.

**Аброўска-рудненская падгрупа** гаворак характарызуецца наступнымі моўнымі асаблівасцямі: наяўнасць цвёрдых заднеязычных у былых спалучэннях ***гы, *кы, *хы**: *тугы́й, городскы́й, сухы́й*; вымаўленне цвёрдага зычнага **[н]** перад этымалагічным **[і]**: *ны́ткы*; наяўнасць цвёрдых свісцячых **[з], [с]** у пазіцыі перад галосным пярэдняга рада **[і]**: *зыма́, сы́ла*; вымаўленне этымалагічна мяккіх **[т'], [д']** перад ѣ: *д'эд, т'э́ло*; наяўнасць ненаціскнога канчатка **-ом** у прыметніках мужчынскага і **-ой** у прыметніках жаночага роду адз. л. у форме М. склону: *у но́вом, у но́вой*; прыналежныя займеннікі ж. роду адз. ліку ***мой, твой, свой*** у форме Р. і Т. склонаў ужываюцца з канчаткам **-ей**: *мойэ́й, з мойэ́й*; зафіксаваны словы *стро́ка, страб'і́ны, ро́шчына* і інш.

Іншыя пучкі ізаглос вызначаюць межы падгруп і гаворак на тэрыторыі **акаючага арэалу**. Так, ружанска-івацэвіцка-баранавіцкі пучок ізаглос (тры ізаглосы) [9, карта № 357] паказвае наяўнасць – адсутнасць галосных **[ô]** і **[ê]** у закрытых складах: *кон', л'эс – кôн', л'êс*, вымаўленне слова *дал'о́ка*, а таксама распаўсюджанне лексемы *лах'іны (лахачы)*. Ружанска-івацэвіцка-слонімскі пучок ізаглос [9, карта № 358] сярод іншага адлюстроўвае пашыранне такой фанетычнай асаблівасці мясцовых гаворак, як вымаўленне пасля губнога **[м]** эпентычных **[й]** і **[н]**: *м'а́со – мйа́со, мн'а́со.*

Акрамя таго, яшчэ два пучкі ізаглос на картах «Атласа гаворак паўночна-ўсходняй Брэстчыны» – зэльвенска-івацэвіцка-ганцавіцкі ды зэльвенска-баранавіцка-ганцавіцкі [9, карта № 359] – вызначаюць шэраг асаблівасцей у гаворках з аканнем. Сярод іх адзначым наяўнасць канчаткаў **[ы], [у]** і **[э]** у назоўніках ніякага роду адз. л. *плячо, вядро: на пл'ачы́, у в'адры́ – на пл'ачэ́, у в'адрэ́ – на пл'ачу́, у в'ядру́*, а таксама націскныя канчаткі **-э** або **-ы** ў назоўніках жаночага роду адз. л. з асновай на зацвярдзелы ў Д. і М. склонах. Так, на поўначы акаючага арэалу прадстаўлены канчатак **-ы**: *на шашы́, на м'ажы́, на гары́*, а на поўдні – канчатак **-э**: *на шашэ́, на м'ажэ́, на гарэ́.*

Таксама гэтыя ж ізаглосы размяжоўваюць назоўнікі мужчынскага роду мн. л. з цвёрдай асновай *сталы́, грыбы́*, якія ў **назоўным склоне** прадстаўлены з канчаткам **-ы** ў большасці гаворак жыхароў паўночна-ўсходняй Брэстчыны (зрэдку паралельна з канчаткам **-э**): *сталы́, грыбы́.* Націскны канчатак **-э** характэрны гаворкам паўночнага захаду рэгіёна, а таксама часта ўжываецца разам з канчаткам **-ы** на ўсім абшары гаворак з аканнем: *сталэ́, грыбэ́.*

Яшчэ адзін пучок ізаглос – баранавіцка-выганаўска-рудненскі [9, карта № 359] – выразна падзяляе гаворкі з аканнем на два асобныя арэалы, у якіх адзначаецца такая фанетычная асаблівасць, як вымаўленне **[о]** ці **[э]** у становішчы пасля губнога **[б]**: *б'о́рдо, бйо́рдо – б'э́рдо, бэ́рдо*, наяўнасць-адсутнасць націскных або ненаціскных канчаткаў **-ам, -ям / -ом, -ём** назоўнікаў муж. роду мн. л. у **давальным склоне**: *стала́м, двара́м, кавал'а́м, в'і́шням, гн'о́здам, пастуха́м – стало́м, дваро́м, кавал'о́м, пастухо́м, в'і́шнём, гн'о́здом*, а таксама канчаткаў **-ах, -ях / -ох, -ёх** у назоўніках муж. і н. роду мн. л. у **месным склоне** пад націскам і не пад націскам *па л'аса́х, па пал'а́х, на луга́х – па л'асо́х, па пал'о́х, на луго́х.*

На яшчэ адным слонімска-выганаўска-ганцавіцкім пучку ізаглос [9, карта № 361] таксама выразна адлюстроўваюцца асаблівасці падгруп і гаворак у складзе арэалу з аканнем. Тут адзначаны такія асаблівасці, як вымаўленне фанемы **[ы]** замест **[у]** у слове *субо́та-сыбо́та*, наяўнасць-адсутнасць пратэтычнага **[j]** у асновах прыналежных займеннікаў: *майго́, твайго́ – маго́, тваго́, шэраг адметных лексем: прако́с-пако́с, капа́-кап'іца.*

Такім чынам, дзякуючы названым ізаглосам, удалося выявіць тры падгрупы гаворак у межах акаючага арэалу: сялявіцкая, коўбавіцка-альхоўская і альшаніцка-боркаўская. Для **сялявіцкай падгрупы гаворак** характэрны: наяўнасць галосных **[о], [э]** у новых закрытых складах: *кот, л'эс*; моцнае яканне: *в'арац'ано́, во́с'ан'*; вымаўленне гука **[э]** на месцы **[а]** у слове **скнара**: *скнэ́ра*; адсутнасць **[й]** пасля губных: *м'а́со, п'ац'*; назоўнікі ж. роду мн. л. у форме Р. склону ўжываюцца з націскам на канчатку: *хато́ў, сц'ано́ў*; наяўнасць суфікса **-ць** у формах інфінітыва з асновай на галосны: *жац', хадз'і́ц'* і формаў інфінітыва тыпу *п'акчы́, таўкчы́.* **Коўбавіцка-альхоўскай падгрупе гаворак** уласцівы: наяўнасць галосных **[ô], [э̂]** у новых закрытых складах: *кôт, л'э̂с*; вымаўленне гука **[ы]** на месцы **[у]** у слове **субота**: *сыбо́та*; наяўнасць **[й]** пасля губных: *мйа́со, пйац'*; наяўнасць формаў інфінітываў тыпу *п'ачы́, таўчы́.* **Альшаніцка-боркаўскай падгрупе гаворак** характэрны: няпоўнае недысімілятыўнае аканне: *го́рэ*; назоўнікі м., ж. і н. роду адз. л. у форме М. склону ўжываюцца з канчаткам **-э**: *на шашэ́, на нажэ́*; наяўнасць суфікса **-ці** ў формах інфінітыва з асновай на галосны: *жа́ц'і, хадз'і́ц'і*; наяўнасць цвёрдага зычнага **[с]** у постфіксе **-са** зваротных дзеясловаў 1 ас. адз. л.: *байу́са, купа́йуса (байу́со, купа́йусо).*

Такім чынам, дзякуючы аналізу ізаглосных карт у «Атласе гаворак паўночна-ўсходняй Брэстчыны» на тэрыторыі даследавання вылучаны 6 падгруп гаворак, што тлумачыцца іх пе-

Рэпазіторый БДПУ

раходным характарам паміж двума буйнымі моўнымі масівамі: паўднёва-заходнім дыялектам і брэсцка-пінскімі гаворкамі, а таксама перыферыйным становішчам у адносінах да слуцка-мазырскіх і сярэднебеларускіх гаворак. Так, у гаворках жыхароў паўночна-ўсходняй Брэстчыны адзначаны такія характэрныя слуцка-мазырскім гаворкам паўднёва-заходняга дыялекту асаблівасці, як вымаўленне спалучэння губнога зычнага з **[й]** перад галоснымі **[а]** і **[о]**: *пйац', мйа́со, мйод* [9, карты 59, 60], форма 1-й асобы множнага ліку дзеясловаў I спражэння з цвёрдым парным зычным або заднеязычным у аснове (г. зн. без чаргавання зычных): *ідом, н'асо́м (н'эсо́м), в'адо́м (вэдо́м)* [9, карта 150]. Сярод асаблівасцей сярэднебеларускіх гаворак адзначым у першую чаргу вымаўленне націскнога галоснага **[о]** на месцы этымалагічнага **[а]** перад **[ў]**: *насто́ўн'ік, казо́ў, броў, уз'оў.* [9, карта 1].

Ранейшымі даследчыкамі (Н. Т. Вайтовіч, А. А. Крывіцкім, Ф. Д. Клімчуком і інш.) на гэтай тэрыторыі вылучаліся толькі гродзенска-баранавіцкая група гаворак паўднёва-заходняга дыялекту, паўночнабрэсцкая група гаворак, пераходныя гаворкі і брэсцка-пінскія (загародскія) гаворкі. Фактычны матэрыял, сабраны намі, дазволіў устанавіць больш дакладныя межы паміж групамі і прапанаваць уласную класіфікацыю гэтых гаворак. У выніку, на тэрыторыі паўночна-ўсходняй Брэстчыны ў межах гродзенска-баранавіцкіх гаворак вылучаны новыя падгрупы гаворак – сялявіцкая, коўбавіцка-альхоўская, альшаніцка-боркаўская (арэал гаворак з аканнем). Акрамя таго, на падставе значна большай колькасці фанетычных, марфалагічных і лексічных асаблівасцей у арэале гаворак з оканнем пацверджана правамернасць вылучэння пэўных груп і падгруп гаворак Ф. Д. Клімчуком, А. В. Леванцэвіч, А. А. Босак, Я. Р. Самуйлікам, а таксама выдзелены асобныя гаворкі ў складзе паўночнабрэсцкай групы гаворак з оканнем.


## Літаратура

1. Лінгвістычная геаграфія і групоўка беларускіх гаворак / пад рэд. Р. І. Аванесава, К. К. Атраховіча (Крапівы), Ю. Ф. Мацкевіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1969. – 80 карт.
2. *Аванесаў, Р. І.* Групоўка дыялектаў беларускай мовы / Р. І. Аванесаў // Нарысы па беларускай дыялекталогіі / пад рэд. Р. І. Аванесава. – Мінск : Навука і тэхніка, 1964. – С. 382–403.
3. *Крывіцкі, А. А.* Дыялекталогія беларускай мовы / А. А. Крывіцкі. – Мінск : Вышэйшая школа, 2003. – 294 с.
4. *Клімчук, Ф. Д.* Гаворкі Заходняга Палесся. Фанетычны нарыс / Ф. Д. Клімчук. – Мінск : Навука і тэхніка, 1983. – 127 с.
5. *Вайтовіч, Н. Т.* Ненаціскны вакалізм народных гаворак Беларусі / Н. Т. Вайтовіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1968. – 219 с.
6. *Босак, А. А.* Дыферэнцыяцыя і арэальныя сувязі гаворак Верхняга Над'ясельдзя : дыс. … канд. філал. навук: 10.02.01 / А. А. Босак. – Мінск, 2006. – 257 с.
7. *Леванцэвіч, Л. В.* Лінгвагеаграфічная групоўка гаворак Бярозаўскага раёна : дыс. … канд. філал. навук: 10.02.01 / Л. В. Леванцэвіч. – Мінск : Інстытут мовазнаўства АН Беларусі, 1996. – 291 с.
8. *Самуйлік, Я. Р.* Лінгвагеаграфія гаворак Выганаўскага Палесся : дыс. … канд. філал. навук: 10.02.01. – Мінск : Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, 2015. – 291 с.
9. *Чарнякевіч, Ю. В.* Атлас гаворак паўночна-ўсходняй Брэстчыны / Ю. В. Чарнякевіч. – Мінск : Тэхналогія, 2009. – 255 с.

## References

1. Lingvistychnaya geagrafiya i grupouka belaruskikh gavorak / pad red. R. I. Avanesava, K. K. Atrakhovicha (Krapivy), Yu. F. Matskevich. – Minsk : Navuka i tekhnika, 1969. – 80 kart.
2. *Avanesau, R. I.* Grupouka dyyalektau belaruskay movy / R. I. Avanesau // Narysy pa belaruskay dyyalektalogii / pad red. R. I. Avanesava. – Minsk : NAvuka i tekhnika, 1964. – S. 382–403.
3. *Kryvitski, A. A.* Dyyalektalogiya belaruskay movy / A. A. Kryvitski. – Minsk : Vysheyshaya shkola, 2003. – 294 s.
4. *Klimchuk, F. D.* Gavorki Zakhodnyaga Palessya. Fanetychny narys / F. D. Klimchuk. – Minsk : Navuka i tekhnika, 1983. – 127 s.
5. *Vaytovich, N. T.* Nenatsisskny vakalizm narodnykh gavorak Belarusi / N. T. Vaytovich. – Minsk : Navuka i tekhnika, 1968. – 219 s.
6. *Bosak, A. A.* Dyferentsyyatsyya i arealnyya suvyazi gavorak Verkhnyaga Nadyaseldzya : dys. … kand. filal. navuk : 10.02.01 / A. A. Bosak. – Minsk, 2006. – 257 s.
7. *Levantsevich, L. V.* Lingvageagrafichnaya grupouka gavorak Byarozauskaga rayona : dys. … kand. filal. navuk : 10.02.01 / L. V. Levantsevich. – Minsk : Instytut movaznaustva AN Belarusi, 1996. – 291 s.
8. *Samuylik, Ya. R.* Lingvageagrafiya gavorak Vyganauskaga Palessya : dys. … kand. filal. navuk : 10.02.01. – Minsk : Belaruski dzyarzhauny universitet, 2015. – 291 s.
9. *Charnyakevich, Yu. V.* Atlas gavorak paunochna-uskhodnyay Brestchyny / Yu. V. Charnyakevich. – Minsk : Tekhnalogiya, 2009. – 255 s.


Рэпазіторый БДПУ